Сацыяльны вектар

# Наперад да актыўнага даўгалецця

## Стартавалі мерапрыемствы да Дня пажылых людзей

**1 кастрычніка ў Беларусі адзначаць Дзень пажылых людзей. У нашай краіне больш за два мільёны чалавек, якія дасягнулі пенсіённага ўзросту, пры гэтым 500 тысяч з іх перасягнулі 75-гадовы ўзрост. Амаль 420 тысяч (кожны пяты пенсіянер) працягвае працаваць. Адной з прычын гэтага самі пажылыя людзі называюць жаданне пазбегнуць адзіноты і заставацца ў калектыве. У сталіцы амаль 300 тысяч пенсіянераў перасягнулі 65-гадовы ўзрост, каля 20 % з іх працуюць. Сярод іх ёсць 17 чалавек у 90-гадовым і старэйшым узросце, пераважна гэтыя людзі займаюцца навуковай і выкладчыцкай дзейнасцю. 89 мінчан перасягнулі 100-гадовы ўзрост, а самая старэйшая жыхарка Мінска якраз у канцы верасня адсвяткуе свой 109-ы дзень нараджэння.**



### АД МАРАФОНУ ДА ТАНЦАВАЛЬНЫХ ФЭСТАЎ

— Сёння Дзень пажылых людзей змяніў сваё значэнне, і гэта не толькі ацэнка і прызнанне працы пажылых грамадзян, але і найперш свята саміх пажылых людзей — актыўных, якія сёння многае робяць, каб наша краіна развівалася і квітнела, — адзначыла **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА**.

Ужо другі год усе мерапрыемствы да Дня пажылых людзей праходзіць у рамках акцыі «Павага, клопат, адказнасць», якая прызвана падкрэсліць павагу маладых пакаленняў да людзей сталага ўзросту. Сярод самых значных падзей — некалькі мерапрыемстваў рэспубліканскага ўзроўню. У гэтыя дні праходзіць II Марафон скандынаўскай хадзьбы «Крок да даўгалецця», дзе бяруць удзел каля пяці тысяч пажылых людзей, а гэта ўдвая больш, чым летась.

Яшчэ адно мерапрыемства для актыўных пажылых людзей — адкрытыя рэспубліканская спаборніцтвы «Спартыўнае даўгалецце», што праходзяць у Мінску на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры і спорту. У ім таксама прымаюць удзел пажылыя беларусы з усёй краіны.

Для аматараў танца па запытах саміх людзей сталага ўзросту праводзіцца некалькі спецыяльных мерапрыемстваў. Сярод іх — абласны баль у Нясвіжы ў Палацава-паркавым комплексе і танцавальны фэст «На крылах танца» з разнастайнай праграмай — ад класічных вальсаў да лацінаамерыканскіх і народных танцаў.

### СЯРОД ПЕРАВАГ — ПРАЦА І АКТЫЎНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

Цікава, што запыты пажылых людзей з часам мяняюцца, пра што сведчаць даследаванні. Чарговае сёлета правёў Інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук. Яно паказала, што пытанні сацыяльнай уключанасці з'яўляюцца вельмі важнымі — кожны трэці апытаны адказаў, што працягвае ці жадае працаваць, каб пазбегнуць адзіноты. Што датычыцца стану здароўя, то кожны другі ўдзельнік назваў яго сярэднім, а кожны чацвёрты — добрым. Дарэчы, сёння да паслуг пажылых — Рэспубліканскі і сем рэгіянальных геранталагічных цэнтраў, пры паліклініках — 116 герыятрычных кабінетаў. Расце і папулярнасць школ актыўнага даўгалецця, у краіне іх ужо 581. Кожны другі рэспандэнт адказаў, што аддае перавагу актыўнаму спосабу жыцця. І амаль трэць апытаных пенсіянераў сустракаюцца са сваімі блізкімі і сябрамі штодзень ці некалькі разоў на тыдзень.

### НАЙСТАРЭЙШАМУ ВАЛАНЦЁРУ — 90 ГАДОЎ

— Улічваючы высокі патэнцыял актыўнасці пажылых людзей, мы развіваем такі кірунак, як валанцёрства. Адзін з прынцыпаў — «Роўны навучае роўнага». Самаму старэйшаму нашаму валанцёру Леаніду Уладзіміравічу Трафімчыку 90 гадоў, ён з Гродзенскай вобласці і праводзіць майстар-класы па шахматах і шашках. Другі кірунак — калі пажылыя людзі навучаюць моладзь. Такі праект пад назвай «Акадэмія дабрыні» рэалізоўваецца Копыльскім тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Людзі старэйшага пакалення навучаюць моладзь навыкам вядзення хатняй гаспадаркі, — расказала Марына Арцёменка.

А вось у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы і Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. Пушкіна рэалізоўваюцца праекты па навучанні студэнтамі пажылых грамадзян камп'ютарнай адукаванасці, англійскай мове, краязнаўству. Дарэчы, навучыцца камп'ютарнай адукаванасці можна і пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Тут працуе 218 такіх гурткоў, дзе займаецца каля дзвюх тысяч чалавек. Адметна, што найстарэйшай слухачкай з'яўляецца 94-гадовая жыхарка Мар'інай Горкі. Увогуле, 159 аддзяленняў пры ТСАНах, якія займаюцца арганізацыяй вольнага часу, карыстаюцца вялікай папулярнасцю і аб'ядноўваюць амаль 17 тысяч пажылых грамадзян.

актуальныя пытанні арганізацыі сацыяльнага абслугоўвання. Як паведаміла Марына Арцёменка, сёння 95 тысяч пажылых грамадзян атрымліваюць сацыяльныя паслугі дома, дзейнічае 32 дагаворы рэнты, у замяшчальных сем'ях пражывае 360 пажылых людзей.

А сама сістэма сацыяльнага абслугоўвання арыентуецца ў першую чаргу на догляд дома. Падрыхтаваны і прыняты ў першым чытанні праект закона «Аб сацыяльным абслугоўванні». Ён прадугледжвае шэраг навацый. У прыватнасці, развіццё сістэмы доўгатэрміновага догляду, якая прадугледжвае інтэграваную сацыяльную і медыцынскую дапамогу, таксама ўкараненне формы дыстанцыйнага сацыяльнага абслугоўвання. Акрамя таго, у сістэму сацыяльнай абароны ўвойдуць



### АРЫЕНТАЦЫЯ НА ДОГЛЯД ДОМА

У больш сталым узросце асноўная патрэба пажылых грамадзян — догляд. Амаль паўмільёна беларусаў дасягнулі ўзросту 75 гадоў і больш. Для іх найбольш

установы новага тыпу — дамы суправаджальнага пражывання. Вядзецца работа над павышэннем іміджу дамоў-інтэрнатаў. Найперш гэта стварэнне ўмоў павышанай камфортнасці і паляпшэнне якасці жыцця пажылых грамадзян.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Буркіна-Фасо прадухілілі спробу дзяржперавароту



Улады Буркіна-Фасо заявілі, што сіламі бяспекі краіны была папярэджана спроба дзяржперавароту. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на агенцтва Reuters. Затрыманы некаторыя ваенныя і грамадзянскія асобы, датычныя да паўстання. Вядзецца вышук астатніх датычных да спробы перавароту. Як паведаміла РІА «Новости», раней стала вядома, што ў Буркіна-Фасо прайшлі мітынгі ў падтрымку ўлад пераходнага перыяду. Пасля гэтага ў сацыяльных сетках пачала распаўсюджвацца інфармацыя пра спробу дзяржперавароту, які быў накіраваны супраць пераходнага ўрада Буркіна-Фасо. Як вядома, напрыканцы верасня мінулага года група вайскоўцаў на чале з капітанам Ібрагімам Траорэ абвясціла аб змяшчэнні кіраўніка ўрада пераходнага перыяду краіны падпалкоўніка Поля-Анры Сандаога Дамібы, прыпыненні дзеяння канстытуцыі і роспуску ўрада. Даміба тады заявіў пра гатоўнасць добраахвотна сысці ў адстаўку пры выкананні мяцежнікамі некалькіх умоў.

### Кім Чэн Ын заявіў аб неабходнасці значна нарасціць ядзерны арсенал КНДР



Лідар КНДР заявіў аб неабходнасці мадэрнізаваць ядзерныя сілы краіны і ў геаметрычнай прагрэсіі нарасціць вытворчасць ядзернай зброі. Пра гэта са спасылкай на агенцтва ЦТАК паведаміла ТАСС. Выступаючы на 9-й сесіі Вярхоўнага народнага сходу КНДР, Кім Чэн Ын таксама адзначыў, што ЗША сваімі дзеяннямі «беспрэцэдэнтна і максімальна ўзмацняюць пагрозу ядзернай вайны». «Больш за тое, яны актывізавалі стварэнне трохбаковага ваеннага альянсу з Японіяй і Рэспублікай Карэя, у выніку чаго «азіяцкая версія НАТА»— крыніца вайны і агрэсіі, нарэшце, выявіле свой агідны выгляд», — сказаў ён. На яго думку, гэта рэальная, а не ўяўная пагроза для Пхеньяна. У сувязі з гэтым Кім Чэн Ын заклікаў да ўмацавання салідарнасці з «антыімперыялістычнымі незалежнымі краінамі», якія «супрацьстаяць гегеманістычнай стратэгіі ЗША і Захаду». Як піша ЦТАК, удзельнікі сесіі разгледзелі і прынялі «праект папраўак і дапаўненняў да Канстытуцыі з мэтай зафіксаваць у асноўным законе статус ядзерных узброеных сіл у абароне дзяржавы і прынцыпы дзяржаўнай дзейнасці ў будаўніцтве ядзерных узброеных сіл».

### У Марыянскай западзіне на рэкорднай глыбіні выяўлены новы вірус



У артыкуле часопіса Microbiology Spectrum паведамляецца, што ў Марыянскай западзіне навукоўцы выявілі новы вірус. Ён быў знойдзены на рэкорднай глыбіні 8,9 тысячы метраў. Пра гэта паведамляюць РІА «Новости». Удакладняецца, што гэта самы глыбока ізаляваны сіфавірус, які быў знойдзены ў акіяне. Новы вірус адносіцца да бактэрыяфагаў, якія заражаюць бактэрыі. Яны адыгрываюць важную ролю ў экалогіі акіяна і не ўяўляюць пагрозы для людзей. Навукоўцы мяркуюць, што новы вірус можа стаць шырока распаўсюджаным у марскім асяроддзі, хоць яго выявілі нядаўна. Атрыманыя даныя дазволяць атрымаць новае ўяўленне аб характарыстыках новага віруснага сямейства Suviridae, адзначаецца ў даследаванні.

Культурная прастора

# Музей у Хатыні, цыкл канцэртаў, аўтарскія альбомы...

## Вызначаны суіскальнікі Прэміі Саюзнай дзяржавы

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшло выніковае пасяджэнне Экспертнага савета па прэміях Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2023-2024 гады пры падтрымцы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы.**

Прэмія Саюзнай дзяржавы прысуджаецца за творы літаратуры і мастацтва, якія спрыяюць умацаванню сяброўскіх, братэрскіх адносін, усебаковаму супрацоўніцтву паміж краінамі — удзельніцамі Саюзнай дзяржавы. Дадзеныя ўзнагароды ўручаюцца раз на два гады.

Пры Пастаянным камітэце Саюзнай дзяржавы створаны Экспертны савет па прэміях з ліку вядомых дзеячаў літаратуры і мастацтва, прадстаўнікоў творчых саюзаў, дзяржустаноў і арганізацый Беларусі і Расіі.

Перад пачаткам таемнага галасавання, на якім абіраліся патэнцыяльныя лаўрэаты, **першы намеснік міністра культуры Беларусі, сустаршыня Экспертнага савета Валерый ГРАМАДА** заўважыў, што ўсе праекты, прадстаўленыя на саіскання прэміі з беларускага боку, заслугоўваюць увагі.

У ліку трох прэтэндэнтаў, вызначаных Экспертным саветам з беларускага боку, — аўтарскі калектыў, які працаваў над стварэннем музея ў Дзяржаўным мемарыяльным комплексе «Хатынь» (архітэктар Віктар Скробат, мастак-манументаліст Андрэй Пяткевіч, дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь Аляксандр Храмы). Таксама на ганаровае званне прэтэндуюць галоўны дырэктар Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларускай дзяржаўнай філармоніі Аляксандр Анісімаў, які стварыў цыкл канцэртаў, прысвечаных Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, і член Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомы даследчык і калекцыянер Уладзімір Ліхадзедаў за стварэнне і рэалізацыю гісторыка-асветніцкага праекта «Бацькаўшчына» і выданне аўтарскіх кніг-альбомаў.

Расійскі бок вылучыў на саісканне прэмій кіраўніка Кубанскага казацкага хору Віктара Захарчанку і аўтарскі калектыў праекта «Смаленская крэпасць у артэфактах бібліятэк і архіваў Саюзнай дзяржавы».

Канчатковае рашэнне аб прысуджэнні прэміі будзе прымацца Вышэйшым дзяржаўным саветам Саюзнай дзяржавы.

**Ганна ПЯТРОВА.**